КРАЕВЕДЧЕСКИЙ КЕЙС СОЛИГОРСКА

# Кожны трэці—вучыцца

Малады горад Салігорск. Яму толькі шэсць гадоў. Новы горад заўсёды вабіць моладзь, гэтых няўрымслівых, задорных юнакоў і дзяўчат. І таму не дзіўна, што амаль кожны трэці ў гэтым горадзе вучыцца.

А вучыцца ёсць дзе. Працуюць дзве сярэднія школы па 1000 і 1500 вучняў, школа рабочай моладзі налічвае 450 навучэнцаў, горнахімічны тэхнікум, у якім вучыцца каля 1000 студэнтаў, вучэбна - кансультацыйны пункт Мінскага палітэхнічнага інстытута, гурткі палітасветы і універсітэты марксізма-ленінізма ахопліваюць каля 4000 чалавек.

Расце і добраўпарадкоўваецца Салігорск. Адных магазінаў тут ужо каля 30. Не так даўно па вуліцы Міра адкрыўся ўніверсальны прадуктовы магазін, а к святу Кастрычніка салігорцы атрымалі яшчэ адзін падарунак— жылы шматкватэрны дом з магазінам.

**В. ЦЕСАВЕЦ,**
**настаўнік.**